СЛОВА КНІЖНАЕ, ШТО СВЯТЛО СОНЕЧНАЕ

Абласной бібліятэцы — 40 год

ХТОСЬЦІ СКАЗАЎ, што без кніг, як і без сяброў, пражыць нельга. У гэтым мы, работнікі абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, пераконваемся кожны дзень. З самай раніцы, як толькі расчыняюцца дзверы, у яе пакоі ўліваецца мноства людзей. Ідуць школьнікі старшых класаў і людзі з пасівелымі скронямі, ідуць студэнты і іх равеснікі ад заводскіх станкоў. Ідуць памарыць, паглыбіцца ў цудоўны свет, які дае багатыя магчымасці для роздуму, перажыванняў. Ідуць, каб глыбей зразумець прыроду чалавечых узаемаадносін, разабрацца ў тым, што ў жыцці часам праходзіць незаўважаным.

А ў гэтыя дні да нас у госці зачасцілі і работнікі сувязі. Не, не пасля работы, як гэта робяць яны звычайна, а ў службовы час. Зачасцілі, каб перадаць віншаванні нашай бібліятэцы ад сяброў па працы з Гомеля і Магілёва, Оршы і Полацка, Браслава і іншых гарадоў рэспублікі і вобласці.

Так, сорак гадоў назад па рашэнню акружнога выканкома ў Віцебску было арганізавана аддзяленне Дзяржаўнай бібліятэкі БССР. Пазней яно было пераўтворана ў самастойную абласную бібліятэку, якой прысвоілі імя Уладзіміра Ільіча Леніна.

З вялікім энтузіязмам прыняліся работнікі бібліятэкі за стварэнне цэнтра кніжнага багацця вобласці. Доўга і карпатліва збіралі яны жамчужыны чалавечай думкі, стараліся як мага паўней задаволіць попыт разняволенага Вялікім Кастрычнікам розуму самых забітых раней слаёў насельніцтва. З кожным годам вырастаў каталог гэтай кніжнай скарбніцы, запаўняліся ўсё новыя і новыя тысячы картачак чытачоў. Кніжны фонд бібліятэкі даходзіў да 100 тысяч экземпляраў, калі над краінай навісла чорная хмара вайны, і ўсё гэтае багацце было поўнасцю знішчана рукамі вандалаў дваццатага стагоддзя.

У верасні 1944 года бібліятэка пачала сваё новае жыццё. Зноў па крупінцы адраджалі кожны стэлаж, кожную кніжную палічку. За дваццаць пасляваенных год яе кніжны фонд вырас да трохсот тысяч экземпляраў.

Галоўную сваю задачу работнікі бібліятэкі бачаць цяпер у актыўнай прапагандзе актуальнай літаратуры, якая садзейнічае камуністычнаму выхаванню працоўных. Для гэтага бібліятэка праводзіць сістэматычныя агляды, дыспуты, канферэнцыі чытачоў, кніжныя выстаўкі і літаратурна-мастацкія вечары.

Вось ужо другі год працуе пры бібліятэцы клуб-універсітэт аматараў літаратуры. Сёлета слухачы азнаёміліся з жыццём і творчасцю Сяргея Ясеніна, праслухалі лекцыю аб маладой савецкай паэзіі.

Толькі летась у абласной бібліятэцы было праведзена 7 канферэнцый чытачоў, 15 літаратурна-мастацкіх вечароў, 9 лекцый і дакладаў, 52 бібліяграфічныя агляды, арганізавана 154 кніжныя выстаўкі.

Вялікую дапамогу аказвае бібліятэка работнікам іншых бібліятэк вобласці. Толькі за апошнія шэсць год для іх практычнай работы было створана некалькі дапаможнікаў («Моладзь і камсамол Віцебшчыны», «Праз дваццаць год» і іншыя).

...Цішыня. Дзесяткі людзей схіліліся над кніжкамі. Толькі зрэдку чуваць, як шалясцяць старонкі. А ў пакоі ўсё заходзяць новыя дзесяткі чытачоў, бо без кніжак, як і без сяброў, пражыць нельга.

В. ВАНЦЕЕЎ,
дырэктар абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.